**Міхаіл Андрэявіч Кляцоўскі**



Нарадзіўся 2 кастрычніка 1924 года ў беднай сялянскай сям'і ў мястэчку Горваль Рэчыцкага раена Гомельскай вобласці. У 1941 годзе скончыў сярэднюю школу. Падчас нямецкай акупацыі Горваль быў спалены разам з жыхарамі, якія не паспелі сысці ў лес. У іх ліку былі бабуля і дзядуля Міхаіла Андрэевіча. Сам ён жыў з маці ў партызанскай зямлянцы ў лесе. Аказваў дапамогу партызанам, быў сувязным. З 1942 года – сувязным партызанскага атрада імя Варашылава. Калі Горваль быў вызвалены ад нямецкіх захопнікаў, Кляцоўскі М.А., скончыўшы курсы радыстаў, пайшоў добраахвотнікам на фронт.

Пасля перанесенай кантузіі і заканчэння радыёспецшколы, ўдзельнічаў у баявых дзеяннях на трох беларускіх франтах. Быў непасрэдным удзельнікам

аперацыі “Багратыен”, вызваляў гарады: Ліду, Ваўкавыск. Удзельнічаў у вызваленні Польшчы, Усходняй Прусіі.

Канец вайны Міхаіл Андрэявіч сустрэў у Нямеччыне пад Берлінам. Затым быў адпраўлены на Далекі Усход на Японскі фронт, але паколькі на той час вайна ўжо скончылася, то поўгалодных, скатаваных вайной салдат прымусілі працаваць па нарыхтоўцы лесу ў сябірскіх лясах.

Пасля дэмабілізацыі, па камсамольскай пуцеўцы, быў накіраваны ў Заходнюю Беларусь для ўзнаўлення і умацавання там Савецкай улады і арганізацыі калгасаў. Спагодку працаваў дырэктарам цагельні ў Віленскім раене.

У 1949 годзе паступіў у Віленскі педагагічны інстытут на завочнае аддзяленне гістарычнага факультэта і пачаў працаваць настаўнікам у школе. Спачатку настаўнікам пачатковых класаў у весцы Кавальчукі, затым – дырэктарам Бярозаўскай школы ў Літве.

З 1954 года па 1961 год – дырэктарам Лаварышскай сярэдняй школы ў Літве. З 1961 года жыў і працаваў у Астравецкім раене: 1961-1962 гг. – дырэктар Варнянская сярэдняй школы; 1962-1984 – намеснік дырэктара Міхалішкаўскай сярэдняй школы.

Узнагароджаны шматлікімі ганаровымі граматамі за мужнасць і адвагу, праяўляную ў гады Вялікай Айчыннай вайны, за паспяховае навучанне і выхаванне падрастаючага пакалення.

Міхаіл Андрэявіч Кляцоўскі ўсе свае свядомае жыцце прысвяціў служэнню Радзіме.

Памер 11 верасня 1998 года.